# Gramática

## 1. Правілы націску

У большасці слоў іспанскай мовы, якія заканчваюцца на **галосны**, а таксама на **зычныя -n**, **-s**, націск падае на перадапошні склад: luna – lúna, lobo – lóbo, iunes – lúnes.

У словах, якія заканчваюцца на **зычны** (акрамя **-n**, **-s**), націск, як правіла, падае на апошні склад: canal – canál.

У словах, дзе націск не адпавядае вышэйназваным правілам, ставіцца графічны знак націска (´): león, Inés.

## 2. Дзяленне на склады і правілы пераносу

1. Калі зычны гук знаходзіцца паміж галоснымі, то ён утварае склад з галосным, які ідзе за ім: lo-bo, ra-na, ra-tón.

2. Калі паміж галоснымі знаходзяцца два зычных, то падзел на склады праходзіць паміж імі: a-lum-no, ár-bol.

Калі ў слове сустракаюцца спалучэнні зычных **pr**, **br**, **fr**, **cr**, **gr**, **tr**, **dr** ці **pl**, **bl**, **fl**, **cl**, **gl**, то яны з’яўляюцца непадзельнымі, напрыклад: pa-dre, ma-dre, ha-blar.

**Заўвага.** Спалучэнне двух галосных не падзяляецца, таму што ўтварае адзін склад: nue-ve, sie-te, cua-tro.

### Правілы пераносу

Правілы дзялення на склады і правілы пераносу **не заўсёды супадаюць**.

1. Нельга пакідаць на адным радку ці пераносіць на другі радок адну літару.

2. Калі ў сярэдзіне слова ёсць літара **h**, то яна ўтварае склад з галоснай, якая ідзе за ёй: al-mo-**ha**-da.

Спалучэнні літар **rr**, **ll**, **ch** утвараюць склад з галоснай, якая ідзе за імі: pe-rro, po-llo, co-che.

# 7. Пытальныя сказы без пытальнага слова

Пытальны сказ без пытальнага слова ўжываецца, калі пытанне ставіцца да ўсяго сказа і патрабуе сцвярждальнага ці адмоўнага адказу: **sí** – так, **no** – не.

У пытальным сказе без пытальнага слова на першым месцы стаіць выказнік, а на другім – дзейнік: ¿Es un oso? ¿Trabaja el padre?

Адказ можа быць поўным ці няпоўным:

¿Está Lola? – Sí. / Sí, está. / Sí, Lola está.

¿Trabaja la madre? – No. / No, no trabaja. / No, la madre no trabaja.

Альтэрнатыўнае пытанне (якое дапускае два ці некалькі адказаў) уяўляе сабой два пытанні, злучаных злучнікам **o** (ці):

¿Es un perro o un gato? – Es un perro. Es un gato.

No es ni un perro, ni un gato. Es un león.